**АРТЫКУЛ 45.** Грамадзяне СССР маюць права на адукацыю.

Гэта права забяспечваецца бясплатнасцю ўсіх відаў адукацыі, ажыццяўленнем усеагульнай абавязковай сярэдняй адукацыі моладзі, шырокім развіццём прафесіянальна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі на аснове сувязі навучання з жыццём, з вытворчасцю; развіццём завочнай і вячэрняй адукацыі; прадастаўленнем дзяржаўных стыпендый і льгот навучэнцам і студэнтам; бясплатнай выдачай школьных падручнікаў; магчымасцю навучання ў школе на роднай мове; стварэннем умоў для самаадукацыі.

(З Канстытуцыі (Асноўнага Закона) Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік).

Пад сонцам самай мудрай
Канстытуцыі,
Якая будзе ззяць нам
з году ў год,
Шасцідзесяцігоддзе
Рэвалюцыі
Сягоння сустракае наш
народ.
І на чале з байцамі-
камуністамі,
Чый прыклад —
нашых поспехаў залог,
Пакрочым мы шляхамі
прамяністымі
Да новых, самых светлых
перамог.

Аляксандр ШАРЫЛАЎ.

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ЧАЦВЕР 13 КАСТРЫЧНІКА 1977 г.

№ 26 (1176)

Цана 2 кап.

# АДНАДУШНАСЦЬ

**Мітынг прафесарска-выкладчыцкага саставу, супрацоўнікаў і студэнтаў БДУ імя У. І. Леніна, прысвечаны прыняццю новай Канстытуцыі СССР.**

Прайшло ўсяго толькі некалькі гадзін з хвалюючага моманту прыняцця ў Маскве, у Вялікім Крамлёўскім палацы новай Канстытуцыі Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, як наш універсітэт уключыўся ў святкаванне гэтай знамянальнай падзеі. Студэнты і аспіранты, супрацоўнікі і выкладчыкі БДУ сабраліся ў актавай зале на мітынг, прысвечаны прыняццю Асноўнага Закона нашай краіны.

Адкрыў мітынг і павіншаваў прысутных са здзяйсненнем падзеі вялікага гістарычнага значэння ў жыцці нашай Радзімы сакратар парткома універсітэта М. С. Гарашчук.

Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР, рэктар БДУ імя У. І. Леніна прафесар У. М. Сікорскі выказаў думку ўсяго нашага калектыву, калі сказаў, што мы прымаем, горача падтрымліваем і клянёмся свята ажыццяўляць новую Канстытуцыю Савецкага Саюза, якая падводзіць вынікі слаўнага 60-гадовага шляху Радзімы. Мы будзем глыбока вывучаць разам з усім народам Асноўны Закон нашай краіны. Неабходна, каб кожны супрацоўнік, аспірант і студэнт дэталёва ведаў нашу Канстытуцыю, таму што нам па ёй жыць, па ёй звяраць сваю працу, свае дасягненні. Мы ганарымся тым, што з'яўляемся сучаснікамі новай Канстытуцыі і ў нейкай меры яе стваральнікамі.

Далей рэктар расказаў, з якімі поспехамі наш універсітэт сустрэў гэта свята, з якімі поспехамі мы набліжаемся да 60-годдзя Савецкай улады. Палепшыліся якасныя паказчыкі вучобы; павялічылася колькасць студэнтаў, якія займаюцца на добра і выдатна; навуковыя распрацоўкі апошняга года дадуць, па папярэдніх падліках, больш за 3 млн. рублёў; актыўны ўдзел прынялі студэнты ў навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 60-годдзю Вялікага Кастрычніка; будатрад БДУ заняў першае месца сярод ВНУ горада і вобласці; вялікая дапамога была аказана студэнтамі універсітэта ва ўборцы бульбы ў сельскіх гаспадарках рэспублікі.

У заключэнне рэктар падкрэсліў задачы, якія стаяць перад універсітэтам у сувязі з прыняццем новай Канстытуцыі СССР.

Студэнтка III курса гістарычнага факультэта, дэпутат Мінскага гарсавета Зінаіда Мельнік гаварыла аб тых вялікіх правах, якія гарантуе савецкай моладзі наша Канстытуцыя. Яна сказала, у прыватнасці:

— Мы можам спакойна вучыцца, будаваць планы на будучыню, таму што нам гарантавана права на мір.



Аб дэмакратычнасці савецкай выбарчай сістэмы, аб правах усіх грамадзян СССР выбіраць і быць выбранымі ў Саветы народных дэпутатаў пасля дасягнення 18 год гаварыў дэпутат Мінскага гарсавета А. Я. Малышаў. Ён заклікаў моладзь адказаць на вялікі давер партыі выдатнай вучобай, работай, актыўным удзелам у грамадскім жыцці.

З гарачым адабрэннем Асноўнага Закона СССР ад імя аспіранцкага саставу БДУ выступіла аспірантка кафедры гісторыі КПСС Г. Ільяшчук.

Загадчык кафедры крыміналістыкі прафесар А. В. Дулаў расказаў, як актыўна ішло абмеркаванне праекта новай Канстытуцыі на юрыдычным факультэце, і з задавальненнем адзначыў, што ў прынятых папраўках да Асноўнага Закона ўлічаны прапановы, якія ўнеслі супрацоўнікі факультэта ў час абмеркавання праекта. Прафесар даў прынцыповую, станоўчую ацэнку новай Канстытуцыі і выказаў упэўненасць, што гэта праграма жыцця будзе ўсімі намі з натхненнем выконвацца.

Удзельнікі мітынгу аднадушна прынялі рэзалюцыю, у якой цалкам і поўнасцю адобрылі новую Канстытуцыю СССР, палажэнні і вывады даклада Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР таварыша Л. І. Брэжнева.

У адказ на клопат роднай партыі і Савецкага ўрада аб росквіце Радзімы, росце дабрабыту савецкіх людзей, калектыў універсітэта запэўнівае Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі, Палітбюро ЦК КПСС на чале з таварышам Л. І. Брэжневым, што прыкладзе ўсе сілы для поўнага і якаснага выканання задач, пастаўленых XXV з'ездам КПСС.

**В. ДРАЧОЎ.**
Фота **аўтара.**

Партыйнае жыццё

## РАПАРТУЕ ЖУРФАК

6 кастрычніка сабраліся камуністы журфака на свой сход, каб абмеркаваць вельмі важнае пытанне «Аб выкананні пастановы ЦК КПСС «Аб 60-й гадавіне Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі» і мерапрыемствах факультэта па падрыхтоўцы да юбілею».

З дакладам па гэтаму пытанню выступіў старшыня прафбюро факультэта, прафесар кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання А. І. Наркевіч.

У спрэчках па дакладу выступілі: ст. выкладчык кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання М. Р. Каваленка, намеснік сакратара камсамольскай арганізацыі факультэта А. П. Саламаха, загадчык кафедры тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі Б. В. Стральцоў, ст. выкладчык кафедры радыё і тэлебачання В. М. Шэін, намеснік сакратара парткома універсітэта І. І. Беленькі, старшыня студэнцкага прафбюро факультэта Л. І. Ракавец, намеснік дэкана факультэта дацэнт А. І. Раковіч.

Сход прыняў пастанову.

## Самая дэмакратычная ў свеце

Гісторыя нашай вялікай Радзімы багатая падзеямі сусветна - гістарычнага значэння. Адной з такіх падзей стала нечарговая сёмая сесія Вярхоўнага Савета СССР дзевятага скліканння, якая аднагалосна прыняла на сваім заключным пасяджэнні 7 кастрычніка новую Канстытуцыю Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік — Асноўны Закон развітога сацыялістычнага грамадства. Цяпер гэтую дату мы будзем адзначаць як Дзень Канстытуцыі СССР.

Усенароднае абмеркаванне праекта Канстытуцыі працягвалася амаль чатыры месяцы. Савецкія людзі ўнеслі каля 400 тысяч прапаноў аб папраўках да асобных артыкулаў праекта Канстытуцыі, што дазволіла прыкметна палепшыць яго змест, унесці ўдакладненні, дапаўненні ў 110 артыкулаў са 173 і дадаць адзін новы артыкул.

Галоўны палітычны вынік усенароднага абмеркавання, як падкрэсліў Л. І. Брэжнеў на сесіі, «складаецца з таго, што савецкія людзі сказалі: так, гэта той Асноўны Закон, якога мы чакалі. Ён правільна адлюстроўвае нашы заваёвы, нашы спадзяванні і надзеі, правільна вызначае нашы правы і абавязкі. Замацоўваючы дасягнутае, ён адкрывае перспектыву далейшага разгортвання камуністычнага будаўніцтва».

**Прыняцце новай Канстытуцыі абумоўлена глыбокімі зменамі, якія адбыліся ў нашай краіне за чатыры дзесяцігоддзі, патрабаваннямі пабудаванага ў СССР развітога, сталага сацыялістычнага грамадства, якое ўяўляе сабой вянец шасцідзесяцігадовага тварэння нашага народа. У якасных адносінах яно істотна адрозніваецца ад грамадства 30-х гадоў, калі прымалася старая Канстытуцыя. За мінулыя 40 гадоў ва ўсіх галінах жыцця Савецкай дзяржавы адбыліся прынцыповыя змены. У цяперашні час сацыялізм развіваецца на асабістай аснове, усё паўней раскрываюцца стваральныя сілы новага ладу, перавагі сацыялістычнага ладу жыцця.**

На базе сацыялістычных інтарэсаў і камуністычных ідэалаў працоўнага класа ўсё больш мацавалася сацыяльна-палітычнае і ідэйнае адзінства савецкага грамадства, склалася новая гістарычная грамадскасць людзей — савецкі народ. Мэта барацьбы пралетарыяту стала мэтай усяго савецкага народа. У гэтых умовах дзяржава дыктатуры пралетарыяту перарасла ў агульнанародную дзяржаву, якая выражае волю і інтарэсы ўсяго народа, а Камуністычная партыя стала партыяй усяго савецкага народа, не страціўшы сваёй класавай сутнасці.

Сімвалічна, што ўрачысты акт прыняцця новай Канстытуцыі СССР адбыўся напярэдадні 60-й гадавіны Кастрычніка. «Гэта не проста супадзенне ў часе дзвюх буйнейшых падзей у жыцці краіны, — адзначаў Л. І. Брэжнеў на сесіі, — сувязь паміж імі значна глыбей. Новая Канстытуцыя — канцэнтраваны вынік усяго шасцідзесяцігадовага развіцця Савецкай дзяржавы, сведчанне паспяховага ажыццяўлення ідэй Кастрычніка, ленінскіх запаветаў».

**Гэты дакумент замацоўвае новы гістарычны рубеж у нашым руху да камунізму—пабудову развітога сацыялізму. У ім дана цэласная карціна развітога сацыялізму, яго палітычнай і эканамічнай сістэм, сацыяльнай асновы, яго духоўнага жыцця, знешняй палітыкі, асабліва падкрэсліваецца, што развітое сацыялістычнае грамадства — заканамерны этап на шляху да камунізму.**

**Вышэйшай мэтай Савецкай дзяржавы Канстытуцыя абвяшчае пабудову бяскласавага камуністычнага грамадства, а яго галоўнымі задачамі — стварэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізму, дасканаленне сацыялістычных грамадскіх адносін і іх ператварэнне ў камуністычныя, выхаванне ўсебакова развітой асобы, павышэнне матэрыяльнага і культурнага ўзроўню жыцця працоўных, забеспячэнне бяспекі краіны, садзейнічанне ўмацаванню міру і развіццю міжнароднага супрацоўніцтва.**

(Заканчэнне на 2-й стар.).

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Новая Канстытуцыя — гэта ўрачысты гімн нашаму нарадаўладдзю, жыватворная крыніца далейшага ўсебаковага развіцця сацыялістычнай дэмакратыі. У ёй атрымалі далейшае развіццё дэмакратычныя прынцыпы фарміравання і дзейнасці Саветаў. Павялічан тэрмін паўнамоцтваў Вярхоўнага Савета СССР, Вярхоўных Саветаў саюзных рэспублік да пяці гадоў, а мясцовых Саветаў — да двух з паловай. Унесены змены ў выбарчую сістэму. Права быць выбранымі ў Вярхоўны Савет СССР маюць грамадзяне, якія дасягнулі 21 года, ва ўсе іншыя Саветы гэтым правам могуць карыстацца грамадзяне, дасягнуўшыя 18-гадовага ўзросту. Адзін і той жа грамадзянін не можа быць выбраны больш чым у два Саветы.

**Вярхоўны Савет СССР, як гаворыцца ў артыкуле 108, правамоцны вырашаць усе пытанні, якія Канстытуцыя адносіць да распараджэння СССР. Артыкул 125 дакладна рэгламентуе ўзаемаадносіны камісій Вярхоўнага Савета па папярэдняму разгляду і падрыхтоўцы пытанняў з дзяржаўнымі і грамадскімі органамі. У адпаведнасці са склаўшайся практыкай тут падкрэсліваецца, што ўсе дзяржаўныя і грамадскія органы, арганізацыі і службовыя асобы абавязаны выконваць патрабаванні камісій Вярхоўнага Савета СССР і камісій яго палат, прадстаўляць ім неабходныя матэрыялы і дакументы.**

Новая Канстытуцыя — і ў гэтым яе асаблівасць — адлюстроўвае ролю і значна пашырае ўдзел прафсаюзаў, камсамола, кааператыўных і іншых грамадскіх арганізацый у рашэнні палітычных, гаспадарчых і культурных пытанняў, устанаўлівае парадак утварэння органаў народнага кантролю і вызначае іх задачы, адлюстроўвае ролю і правы працоўных калектываў — асноўнай ячэйкі сацыялістычнага грамадства.

У Канстытуцыі ўсебакова раскрыта сутнасць эканамічнай сістэмы СССР, атрымалі замацаванне асноўныя элементы эканамічнай стратэгіі партыі, ленінскія прынцыпы кіраўніцтва народнай гаспадаркай.

Кожны артыкул Асноўнага Закона прасякнут клопатам аб чалавеку і аб яго дабрабыце. Ён замацоўвае шырокія сацыяльна - эканамічныя і палітычныя правы, свабоды і абавязкі грамадзян. Дзяржава гарантуе кожнаму чалавеку ўдзел у кіраванні дзяржаўнымі і грамадскімі справамі, атрыманне адукацыі, ахову здароўя, забеспячэнне жыллём, карыстанне дасягненнямі культуры, адпачынак, матэрыяльнае забеспячэнне ў старасці, палітычныя свабоды, свабоду навуковай, тэхнічнай і мастацкай творчасці і г. д.

**У тым ліку гарантавана самае жыццёвае, самае неабходнае права чалавека — права на працу. У новай Канстытуцыі яно дапоўнена правам на выбар прафесіі, роду заняткаў і работы ў адпаведнасці з прызваннем, здольнасцямі, прафесійнай падрыхтоўкай, адукацыяй і ўлікам грамадскіх патрэбнасцей.**

**Кожны грамадзянін СССР мае права ўносіць у дзяржаўныя і грамадскія арганізацыі прапановы аб паляпшэнні іх дзейнасці, крытыкаваць недахопы ў рабоце.**

**У арганічным адзінстве з правамі грамадзян у Канстытуцыі замацаваны і іх абавязкі: выконваць усе законы, добрасумленна працаваць, прытрымлівацца правілаў сацыялістычнага супольнага жыцця, берагчы і ўмацоўваць сацыялістычную ўласнасць, абараняць Бацькаўшчыну, садзейнічаць замацаванню міру, клапаціцца аб выхаванні дзяцей, аб бацьках і г. д.**

# САМАЯ ДЭМАКРАТЫЧНАЯ Ў СВЕЦЕ

Мясцовыя Саветы заклікаць Канстытуцыяй рашаць не толькі пытанні мясцовага значэння, але ў межах сваіх праў сістэматычна кантраляваць і павышаць эфектыўнасць дзейнасці выканаўчых і распарадчых органаў, усіх арганізацый і службовых асоб.

На ўмацаванне сувязі Саветаў з масамі накіраваны таксама артыкулы 94, 102, якія прадугледжваюць шырокую галоснасць дзейнасці Саветаў, рэгулярную справаздачнасць іх і выканаўчых і распарадчых органаў перад насельніцтвам, інфармаванне Саветамі выбаршчыкаў аб выкананні іх наказаў, шырокае прыцягненне грамадзян да ўдзелу ў сваёй працы.

**У Канстытуцыю ўключана новая глава «Народны дэпутат», якая замацоўвае паўнамоцтвы дэпутатаў, зацвярджае гарантыі дэпутацкай дзейнасці, устаноўленыя законам аб статусе дэпутатаў і іншымі заканадаўчымі актамі Саюза ССР, саюзных і аўтаномных рэспублік. Гэта будзе садзейнічаць павышэнню ролі і адказнасці народных дэпутатаў.**

**Асаблівасць Канстытуцыі заключаецца ў тым, што яна забяспечвае адпаведнасць задач дзяржаўных органаў, іх структуры, функцый, парадку дзейнасці патрабаванням развітога сацыялістычнага грамадства.**

Сіла нашага ладу, указваў У. І. Ленін, у тым, што масы аб усім могуць меркаваць і ідуць на ўсё свядома. Акумулюе гэту сілу і накіроўвае яе на паскарэнне нашага руху да камунізму партыя камуністаў — натхніцель і арганізатар усіх нашых перамог, носьбіт прынцыпаў сацыялістычнага дэмакратызму і гарант яго паступальнага развіцця.

Сапраўдная роля Камуністычнай партыі ў палітычнай сістэме ўсенароднай дзяржавы замацавана ў Асноўным Законе. У артыкуле 6, у прыватнасці, гаворыцца: «Кіруючай і накіроўваючай сілай савецкага грамадства, ядром яго палітычнай сістэмы, дзяржаўных і грамадскіх арганізацый з'яўляецца Камуністычная партыя Савецкага Саюза. КПСС існуе для народа і служыць народу...»

**Канстытуцыйнае замацаванне ролі Камуністычнай партыі не дае ніякіх пераваг яе членам. Наадварот, гэта ўскладае на іх яшчэ большую адказнасць.**

Адметнай асаблівасцю Канстытуцыі з'яўляецца і тое, што яна замацоўвае ленінскія прынцыпы знешняй палітыкі, забяспечвае сапраўднае дэмакратычнае спалучэнне агульных інтарэсаў шматнацыянальнай дзяржавы і інтарэсаў кожнай са складаючых яе рэспублік.

Увесь змест Канстытуцыі СССР гаворыць аб тым, што ідэі Кастрычніка, запаветы У. І. Леніна паслядоўна і паспяхова ажыццяўляюцца, што яна ў поўнай меры адлюстроўвае і сённяшні і заўтрашні дзень нашай Радзімы. У ёй сінтэзавана ўсё лепшае з практыкі сацыялістычнага будаўніцтва, вопыт канстытуцыйнага развіцця краін сацыялістычнай садружнасці, прынцыповыя палажэнні нашых мінулых Канстытуцый, савецкага заканадаўства. З поўнай падставай можна сказаць: Асноўны Закон СССР можа служыць узорам творчага развіцця марксізму-ленінізму, прадстаўляе сабой скарбніцу вопыту сусветнага сацыялізму.

Прыняцце новай Канстытуцыі СССР мае велізарнае міжнароднае значэнне. Яна дапаможа камуністам брацкіх сацыялістычных краін дакладней вызначыць перспектывы стварэння і ўдасканалення развітога сацыялізму — неабходнае звяно сацыяльных пераўтварэнняў, адносна доўгую паласу развіцця на шляху ад капіталізму да камунізму. Гэты дакумент — натхняючы прыклад для маладых суверэнных дзяржаў і для працоўных капіталістычных краін.

**П. БОНДАР,**
**дацэнт кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў.**

# КУРС — ПАВЫШЭННЕ АКТЫЎНАСЦІ

Калі я гартаю старонкі новай Канстытуцыі СССР, успамінаю словы пісьменніка Міколы Білкуна. **«Наша Канстытуцыя, — сказаў ён, — пісалася камендорамі крэйсера «Аўрора» і рабочымі Пуцілаўскага завода, якія ішлі на штурм Зімняга палаца, коннікамі Шчорса і Чапаева, байцамі Фрунзе, хто грудзьмі сваімі разрываў дрот Перакопа, мільёнамі Павак Карчагіных, змяніўшых штык і шаблю на кірку і рыдлёўку, каб падняць краіну з руін грамадзянскай вайны. Яна пісалася будаўнікамі Днепрагэса, Магніткі, Камсамольска-на-Амуры, тымі, хто абараніў Маскву, выстаяў пад Сталінградам і падняў Чырвоны сцяг Перамогі над рэйхстагам. Наша Канстытуцыя стваралася ў заводскіх цэхах, на калгасных палетках, у лабараторыях вучоных, у рабочых кабінетах пісьменнікаў. Яна — калектыўнае стварэнне...».**

Сказана вельмі правільна. Тэкст Асноўнага Закона, па якому нам жыць, пісала ўся наша 60-гадовая гісторыя, усе савецкія людзі. Гэта асабліва ўсведамляеш сёння — у час прыняцця новай Канстытуцыі, у год юбілею Савецкай дзяржавы.

Ва ўсіх групах, на ўсіх курсах нашага факультэта ідзе зацікаўленае вывучэнне артыкулаў Канстытуцыі. Студэнты і выкладчыкі аднадушныя ў сваіх выступленнях: поўнасцю адабраем і падтрымліваем. Зараз ідзе падрыхтоўка нечарговага нумара насценнай газеты «Журналіст», прысвечанага прыняццю Канстытуцыі.

З 1 па 8 лістапада на факультэце пройдзе Тыдзень рэвалюцыйнай славы. Ветэраны грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў раскажуць студэнтам, як здабывалася свабода, як пісалася Канстытуцыя. Напярэдадні 60-годдзя Вялікага Кастрычніка адбудзецца вечар сустрэчы з журналістамі — выпускнікамі нашага факультэта, удзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны, якія адшукалі члены групы «Доўг».

Мы ўсведамляем, што абавязак савецкіх людзей, і асабліва моладзі, быць на ўзроўні ідэй, якімі насычан тэкст новай Канстытуцыі. Гэтае ўсведамленне можна праілюстраваць прыкладамі з дзейнасці студэнтаў на сельгасработах. Журналісты працавалі на калгасных палетках, кіруючыся лозунгамі «Сёння больш, чым учора», «Кожны дзень — ударны!» Яны праводзілі суботнікі, прысвечаныя 60-годдзю Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, а заробленыя грошы пералічвалі ў фонд Маскоўскага райкома камсамола г. Мінска. Студэнты дапамагалі ветэранам вайны і працы па гаспадарцы, шэфствавалі над сельскімі школамі, чыталі лекцыі, прапагандуючы асноўныя палажэнні Канстытуцыі. Скажу, што кожны другі студэнт факультэта атрымаў Ганаровую грамату — РК КПБ, РК ЛКСМБ ці праўлення калгаса.

У новай Канстытуцыі ёсць нямала палажэнняў, якія падмацоўваюць і стымулююць актыўнасць савецкіх людзей, садзейнічаюць развіццю іх творчых сіл. Я ўпэўнен, што рэалізацыя палажэнняў Канстытуцыі ўзніме на якасна новы ўзровень усю вучэбную, навуковую, культурную дзейнасць у нашай вышэйшай установе. Камсамольцы факультэта журналістыкі з энтузіязмам прымаюць удзел у гэтай дзейнасці.

**А. САЛАМАХА,**
**намеснік сакратара камітэта камсамола факультэта журналістыкі, студэнт II курса.**

# ДАЛУЧАЮ ГОЛАС

«Поўнасцю адабраю і падтрымліваю», — гэтыя словы ў адрас новай Канстытуцыі СССР гавару не толькі я, але ўвесь калектыў нашага факультэта. Калі мы слухалі па радыё, чыталі ў друку матэрыялы нечарговай сёмай сесіі Вярхоўнага Савета СССР дзевятага склікання, увесь час не пакідала пачуццё ўрачыстасці, усвядомленасці вялікай падзеі ў жыцці нашага народа, падзеі, якая ўвойдзе чырвоным радком ва ўсе падручнікі і календары, стане магутным стымулам далейшага развіцця роднай краіны па шляху да камунізму.

У новай Канстытуцыі, тварцом якой з'явіўся ўвесь народ, глыбока замацоўваюцца і развіваюцца многія правы грамадзян Савецкага Саюза, у тым ліку— правы на грамадскую актыўнасць. Летам гэтага года я працаваў камісарам Наваржэўскага занальнага студэнцкага будаўнічага атрада імя Кастрычніцкай рэвалюцыі Пскоўскай вобласці. Сваімі вачыма бачыў я, якія шырокія магчымасці прадастаўляе наша дзяржава маладым, ствараючы ўсе ўмовы для таго, каб іх энергія і ініцыятыва знаходзілі дастойнае прымяненне на карысць народнай гаспадаркі. Байцам СБА была прадастаўлена магчымасць працаваць з поўнай аддачай сіл, актыўна адпачываць. Яны жылі ў светлых добраўпарадкаваных памяшканнях, добра харчаваліся, мелі мастацкія прыналежнасці, спортінвентар. На шчыры, бацькоўскі клопат байцы адказалі справай — у сціслыя тэрміны студэнцкага лета пабудавалі школы, жылыя дамы, сельскагаспадарчыя памяшканні. На памяць жыхарам Пскоўшчыны засталіся песні атрадных агітбрыгад, адноўленыя рукамі будатрадаўцаў помнікі загінуўшым, піянерскія кастры, цікавыя лекцыі, добрыя паслугі...

Заўзята працавалі і актыўна адпачывалі тыя мае сябры, якія ў верасні дапамагалі працаўнікам вёскі ўбіраць бульбу.

Мае аднакурснікі, і я ўпэўнен, усе студэнты універсітэта, гатовы з гонарам выканаць абавязкі, якія ўскладае на іх новая Канстытуцыя.

Зацвярджэнне Асноўнага Закона першай у свеце агульнанароднай сацыялістычнай дзяржавы выклікае імкненне вучыцца і працаваць яшчэ лепш, чым раней.

Сёння я зноў успамінаю словы Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Л. І. Брэжнева, сказаныя 7 кастрычніка: **«Мінуць гады, дзесяцігоддзі, але гэты кастрычніцкі дзень назаўсёды застанецца ў памяці народнай як яскравае сведчанне сапраўднага трыумфу ленінскіх прынцыпаў народаўладдзя».**

**В. ЛЕВАШЭВІЧ,**
**сакратар камітэта камсамола гістфака, студэнт IV курса.**

# ВЫКАРЫСТОЎВАЦЬ

У мінулым навучальным годзе факультэты, кафедры, прафесарска-выкладчыцкі састаў універсітэта шмат папрацавалі над выкананнем сацыялістычных абавязацельстваў, прынятых у гонар 60-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

Дзякуючы вялікай арганізатарскай рабоце рэктарата, партыйнай, камсамольскай і прафсаюзнай арганізацый, дэканатаў і кафедр дасягнуты значныя поспехі ў павышэнні якасці падрыхтоўкі будучых спецыялістаў, камуністычным выхаванні студэнцкай моладзі, росце навуковых дасягненняў і ўмацаванні вучэбна-матэрыяльнай базы.

Кафедры, факультэты правабілі вялікую работу па удасканаленню вучэбных праграм, па перагляду зместу лекцый, метадычных распрацовак, семінарскіх заняткаў, паляпшэнню пастаноўкі лабараторных практыкумаў, спецкурсаў і спецсемінараў, паляпшэнню вучэбнай і вытворчай практыкі студэнтаў.

У рабоце факультэтаў, кафедр значнае месца сталі займаць пытанні павышэння якасці вучэбнага працэсу, камуністычнага выхавання, пастаноўкі навукова-даследчай і метадычнай работы. Вялікая работа праводзілася па прапагандзе і ажыццяўленню рашэнняў XXV з'езда КПСС, XXVIII з'езда КПБ. Усё гэта садзейнічала больш глыбокаму вывучэнню марксісцка-ленінскай тэорыі, ленінскай тэарэтычнай спадчыны, мерапрыемстваў партыі па камуністычнаму будаўніцтву, больш дакладнай пастаноўцы вучэбна-выхаваўчай работы і станоўча адбілася на выніках навучальнага года.

Абсалютная паспяховасць нагул па універсітэту ў параўнанні з 1976-77 навучальным годам павысілася і складае 93,7 працэнта. Павялічылася колькасць студэнтаў, якія здалі летнюю сесію на выдатна, з 12,5 працэнта да 13,8 працэнта, на выдатна і добра з 45,6 працэнта да 46,2 працэнта, колькасць нездавальняючых адзнак паменшылася з 6,8 працэнта да 6,1 працэнта. Найбольш высокай паспяховасці дабіліся па дзённай форме навучання факультэты: юрыдычны—98,3 працэнта, геаграфічны — 97,8 працэнта, гістарычны — 96,5 працэнта.

Разам з тым вынікі года сведчаць аб тым, што асобныя факультэты і кафедры не выкарыстоўвалі ўсіх маючыхся магчымасцей для павышэння ўзроўню вучэбна-выхаваўчай работы, і паказчыкі іх работы знізіліся ў параўнанні з мінулым годам. Так, паспяховасць на факультэце прыкладной матэматыкі знізілася на 1,6 працэнта (з 91,9 працэнта да 90,3 працэнта), на факультэце радыёфізікі і электронікі на 2,4 працэнта (з 91,1 працэнта да 88,7 працэнта). На фізічным факультэце хаця і маецца рост паспяховасці, аднак яна ніжэй сярэдніх паказчыкаў па БДУ.

Па-ранейшаму застаецца нізкай паспяховасць студэнтаў першых курсаў (на I курсах — 90,6 працэнта, на II курсах — 89,4 працэнта). Дэканаты і кафедры, грамадскія арганізацыі не дабіліся 100-працэнтнай наведваемасці заняткаў і поўнага ліквідавання амаральных учынкаў. Не ўсё яшчэ зроблена ў правільнай расстаноўцы і эфектыўным выкарыстанні кадраў навукова-педагагічных работнікаў, многія прафесары і дацэнты маюць невялікую лекцыйную нагрузку, у той жа час расце колькасць выкладчыкаў на ўмовах пагадзіннай аплаты.

Факультэты і кафедры ўсё яшчэ недастаткова шырока і інтэнсіўна ўкараняюць тэхнічныя сродкі навучання ў вучэбны працэс. У шэрагу выпадкаў не поўнасцю выкарыстоўваецца або зусім не выкарыстоўваецца дарагакаштуючае абсталяван-

# Праверка ведаў—практыка



Студэнты IV курса геафака, якія праходзілі гэтым летам вытворчую практыку па геадэзіі і картаграфіі, пачалі свой чарговы семестр з абароны справаздач па практыцы. Адны з іх у час практыкі склалі карты шчыльнасці насельніцтва нашай рэспублікі. На картах гэтых адлюстраваны таксама звесткі аб колькасці школ, бібліятэк, бальніц у кожным раёне Беларусі. Другія праводзілі тапаграфічную здымку мясцовасці для мэт меліярацыі, гарадскога і сельскага будаўніцтва.

Справаздачы па практыцы ў чацвёртакурснікаў прымала камісія, у якую ўвайшлі: загадчык кафедры геадэзіі і картаграфіі В. Я. Крышчановіч і намеснік дэкана факультэта Р. А. Жмойдзяк. Было адзначана, што паспяхова прайшлі практыку студэнткі Ж. Каратаева і В. Шэленгоўская. Яны даследавалі абслугоўванне насельніцтва ў Валожынскім, Лагойскім, Пухавіцкім, Уздзенскім, Гомельскім, Рэчыцкім, Хойніцкім і Лоеўскім раёнах. Высокія адзнакі атрымалі таксама Т. Саульская, Т. Рошчанка і многія іншыя.

**В. ДРАЧОЎ.**

Фота аўтара.



# Павышаць ідэалагічны ўзровень

1977 год займае асаблівае месца ў гісторыі. Савецкі народ, усё прагрэсіўнае чалавецтва рыхтуюцца дастойна сустрэць 60-годдзе Вялікага Кастрычніка. Прыняты і паспяхова выконваюцца павышаныя сацыялістычныя абавязацельствы.

Гэты год з'яўляецца асабліва паспяховым і для калектыву кафедры фізікі паўправаднікоў, узначальваемага прафесарам В. Д. Ткачовым. Партыйны сход фізічнага факультэта, разгледзеўшы ход выканання прынятых сацыялістычных абавязацельстваў, адобрыў дзейнасць кафедр фізікі паўправаднікоў, ядзернай фізікі і цеплафізікі па арганізацыі і кіраўніцтву сацыялістычным спаборніцтвам. Вялікую ролю ў паспяховым выкананні сацыялістычных абавязацельстваў на кафедры фізікі паўправаднікоў адыграла работа філасофскага семінара, уплыў якога адбіўся як на павышэнні ідэалагічнага ўзроўню выкладчыкаў і супрацоўнікаў кафедры, так і на арганізацыі і мабілізацыі ўсіх сіл на паспяховае выкананне намечаных мерапрыемстваў.

Вынікі работы філасофскага семінара падведзены на сходзе партыйнай групы кафедры. У пачатку навучальнага года кіраўніком семінара, выкладчыкам Н. Кісель, і старастай семінара дацэнтам В. Урэневым сумесна з партбюро фізфака была выпрацавана праграма і тэматыка работы семінара, якая грунтуецца на рашэннях XXV з'езда КПСС аб ролі навукі ў пабудове камунізму і далейшым павышэнні ідэйнай перакананасці і метадалагічнай культуры савецкіх вучоных. «Савецкі вучоны — калі, зразумела, гэта сапраўдны савецкі вучоны, — ва ўсёй сваёй навуковай дзейнасці зыходзіць з навуковага светапогляду марксізму-ленінізму, з'яўляецца актыўным барацьбітом за справу камунізму, супраць любых сіл рэакцыі і цемрашальства», — гаварыў Л. І. Брэжнеў.

Тэматыка семінара ўключала дзве групы пытанняў: «XXV з'езд КПСС аб ролі навукі ў развіцці вытворчых сіл камуністычнага грамадства і фарміраванні камуністычных грамадскіх адносін, усебаковага развіцця асобы і выхавання новага чалавека»; «Чалавек, грамадства і прырода ва ўмовах навукова-тэхнічнай рэвалюцыі». Выпрацаваная праграма была абмеркавана на першым арганізацыйным пасяджэнні семінара. Пры гэтым удзельнікі семінара былі падрабязна азнаёмлены з літаратурнымі крыніцамі па ўсіх тэмах заняткаў. Тэмы дакладаў былі размеркаваны паміж дакладчыкамі на ўвесь перыяд. За месяц да чарговага пасяджэння на кафедральнай дошцы вывешвалася аб'ява, дзе ўказваліся імёны дакладчыкаў, тэмы іх дакладаў і пералік рэкамендуемай літаратуры. Гэтыя аб'явы не толькі інфармавалі грамадскасць кафедры, але і арганізоўвалі і мабілізоўвалі яе. Такім чынам, усе супрацоўнікі і выкладчыкі кафедры маглі актыўна ўдзельнічаць у выпрацоўцы тэматыкі семінара на год і ў абмеркаванні пытанняў на яго пасяджэннях.

Усяго за год было праведзена 8 заняткаў, на якіх быў заслухан 21 даклад. Належыць асабліва адзначыць даклады выкладчыкаў В. Яржэмбіцкага, С. Мішука, І. Казлова, В. Пятрова, А. Патрына, а таксама іншых, якія вызначаліся добрай прапрацоўкай многіх літаратурных крыніц. Адзначым таксама вялікую актыўнасць у рабоце семінара маладых супрацоўнікаў кафедры, што з'яўляецца несумненным поспехам яго работы.

У арганізацыі правядзення семінарскіх заняткаў вялікую ролю адыграла пастаянная ўвага і дапамога члена партбюро фізічнага факультэта дацэнта І. Рагоўскага і абмеркаванне вынікаў работы семінара на пасяджэнні сектара палітвучобы, дзе была адзначана актыўная работа старасты — дацэнта В. Урэнева па арганізацыі палітзаняткаў.

У канцы навучальнага года была вызначана тэматыка заняткаў на 1977-78 навучальны год. Намечана правесці 8 заняткаў семінара «Метадалагічныя праблемы навукі на сучасным этапе», размеркаваны тэмы заняткаў і складзены ўдакладнены спіс удзельнікаў семінара. Першае пасяджэнне семінара будзе прысвечана 60-годдзю Вялікага Кастрычніка.

Мы спадзяемся, што і ў гэтым навучальным годзе паспяхова пройдуць заняткі па ідэалагічнаму выхаванню супрацоўнікаў і выкладчыкаў кафедры фізікі паўправаднікоў.

**В. СТЭЛЬМАХ,**
**дацэнт, намеснік загадчыка кафедры фізікі паўправаднікоў.**



# БІБЛІЯТЭКА: ІНІЦЫЯТЫВА І ПОШУК

**Гутарка з дырэктарам бібліятэкі універсітэта І. У. АРЭХОЎСКАЙ.**

**— Іраіда Уладзіміраўна, сённяшнюю размову хацелася б пачаць з падзеі, якая хвалюе ўсю грамадскасць нашай краіны. Гэта падрыхтоўка да юбілею Савецкай улады. Мы ўжо пісалі, што бібліятэка напярэдадні 60-годдзя Вялікага Кастрычніка адкрые новы аддзел — своеасаблівы музей каштоўных і рэдкіх кніг. Напэўна, ёсць і іншыя падарункі да святочнай даты?**

— Так. З гонарам паведамляю, што наш калектыў выканаў узятыя сацыялістычныя абавязацельствы датэрмінова. Мы актыўна ўключыліся ў агляд бібліятэк ВНУ і сярэдніх спецыяльных устаноў рэспублікі, які прысвечан 60-годдзю Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

Упершыню сярод бібліятэк вышэйшых навучальных устаноў мы распрацавалі комплексную праграму ідэйна-выхаваўчай работы са студэнтамі на 5-гадовы перыяд навучання ва універсітэце. Праграма мае чатыры раздзелы: ідэйна-выхаваўчая работа па курсах, працоўнае (прафесійнае) выхаванне студэнтаў, маральнае выхаванне і план распрацовак у дапамогу агульнауніверсітэцкім мерапрыемствам.

Калі гаварыць канкрэтна, то першы раздзел, напрыклад, прадугледжвае правядзенне гутарак аб правілах карыстання бібліятэкай і захавання кніг; заняткі па асновах бібліятэказнаўства і бібліяграфіі «Уводзіны ў спецыяльнасць», экскурсіі па аддзелах бібліятэкі; удзел у пасвячэнні ў студэнты; выстаўкі, сустрэчы, гутаркі і г. д.

**— Я заўважу, што гэтыя мерапрыемствы ў асноўным праводзіліся і раней. Але сёння яны прыведзены ў сістэму, атрымалі агульную накіраванасць. Тое, што комплексная праграма распрацавана іменна ў нашай бібліятэцы — не выпадкова, яна з'яўляецца адной з самых старэйшых бібліятэк ВНУ рэспублікі, мае традыцыі, вопыт, добрыя кадры.**

— І тым не менш мы пастаянна імкнемся ўдасканальваць сваю працу, шукаем новыя формы і метады работы.

Нядаўна ў бібліятэцы паявілася картатэка забяспечанасці літаратурай. Магчыма, не ўсе супрацоўнікі БДУ ведаюць аб гэтым. А трэба, каб выкладчыкі пацікавіліся, якія кнігі яна змяшчае. Відавочна, некаторыя выданні ўстарэлі, выкладчык можа паведаміць нам аб гэтым, даць «дабро» на спісанне.

А вось другое новаўвядзенне. Здаўна праблемай нумар адзін з'яўлялася пытанне месцазнаходжання кнігі: у каго з чытачоў яна на руках або ў якім падраздзяленні бібліятэкі затрымалася. Каб гэта ўстанавіць, патрабавалася літаральна перакласці гару папер. З верасня ўведзена «сістэма намеснікаў». Гэта значыць, што бібліятэкар, выдаючы літаратуру, ставіць на яе месца кардонку з фармулярам, дзе запісана прозвішча чытача, нумар яго білета, дата выдачы і г. д.

У нас таксама ёсць змены ў групавым абслугоўванні студэнтаў.

**— Раскажыце пра гэта больш падрабязна.**

— Дакладана, па графіку, у пэўны дзень і пэўную гадзіну прыходзіць група студэнтаў, і кожны атрымлівае камплект падручнікаў. Такім чынам на абслугоўванне групы ўходзіць 30 хвілін — па 1,5 хвіліны на аднаго чалавека. Гэтая сістэма значна эканоміць час і студэнтаў, і бібліятэкара; мы атрымалі магчымасць разлічыць колькасць падручнікаў на кожны факультэт, паток, курс.

У гэтым годзе ў сістэму групавога абслугоўвання ўнесены змены.

Па-першае, мы абслугоўваем не толькі студэнтаў 1—2 курсаў, але і 3—4. Па-другое, раней вучэбная літаратура выдавалася ў чытальных залах і на вучэбным абанеменце. Цяпер да гэтай справы падключаны навуковы абанемент, навукова-метадычны аддзел і сектар інфармацыі. Па-трэцяе, рабочы дзень гэтых падраздзяленняў прадоўжаны да 21 з паловай гадзіны вечара.

Намі складзен агульны графік абслугоўвання чытачоў. Цяпер — справа за факультэтамі. Ад іх залежыць, каб выдача літаратуры праходзіла арганізавана. Між іншым, прапускная здольнасць бібліятэкі — абслугоўванне па 12 груп у дзень на кожным абанеменце!

Мы б хацелі мець больш цесныя, чым зараз, сувязі з метадыстамі факультэтаў, а таксама з выкладчыкамі кафедры замежных моў (галоўны корпус). У іх няма пакуль традыцыі загадзя інфарміраваць бібліятэку аб рэкамендуемай літаратуры. А гэта для нас вельмі важна.

Сумеснымі намаганнямі, я думаю, мы можам падняць работу бібліятэкі на больш высокі ўзровень, які б поўнасцю адпавядаў інтэлектуальнаму развіццю нашага чытача.

**Гутарку вяла Н. НІКОЛІЧ.**

# РЭЗЕРВЫ

не. Неабходна глыбока прааналізаваць вынікі 1976-77 навучальнага года і абмеркаваць іх на саветах факультэтаў і пасяджэннях кафедр, намеціць канкрэтныя мерапрыемствы па далейшаму паляпшэнню якасці падрыхтоўкі і выхавання будучых спецыялістаў, павысіць узровень пастаноўкі вучэбна-выхаваўчага працэсу на аснове строгага выканання вучэбных планаў і праграм, укаранення прынцыпаў навуковай арганізацыі вучэбнага працэсу, стварэння ўмоў для няўхільнага росту творчай актыўнасці студэнтаў.

Дэканатам і кафедрам неабходна ўзмацніць кантроль за арганізацыяй самастойнай работы студэнтаў у міжсесійны перыяд.

Належыць таксама актывізаваць работу курсавых і метадычных камісій.

Нам неабходна яшчэ больш умацоўваць сувязі і дзелавыя кантакты факультэтаў з прамысловымі, сельскагаспадарчымі прадпрыемствамі, установамі навукі і культуры на аснове дагавораў аб супрацоўніцтве, накіраваных на павышэнне якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, паспяховае выкананне заданняў дзесятай пяцігодкі, садзейнічаць прыцягненню вядучых спецыялістаў народнай гаспадаркі, навукі і культуры, якія валодаюць вялікім вопытам практычнай работы, да педагагічнай дзейнасці ва універсітэце, пашыраць удзел прафесарска-выкладчыцкага саставу факультэтаў, кафедр у павышэнні кваліфікацыі спецыялістаў прамысловых і сельскагаспадарчых прадпрыемстваў.

З мэтай фарміравання ў будучых спецыялістаў навыкаў работы ў калектыве, умення вырашаць канкрэтныя вытворчыя задачы неабходна здзейсніць мерапрыемствы, накіраваныя на ўдасканаленне арганізацыі практыкі і стажыроўкі, прыцягненне студэнтаў да непасрэднага ўдзелу ў вытворчай дзейнасці.

Трэба прыняць меры па ўсебаковаму ўдасканаленню сістэмы падрыхтоўкі кадраў без адрыву ад вытворчасці, павышэнню ўзроўню пастаноўкі вучэбнага працэсу і арганізацыі навукова-метадычнай работы на вячэрніх аддзяленнях і завочным факультэце.

Бібліятэчным работнікам неабходна палепшыць бібліятэчна-бібліяграфічнае абслугоўванне прафесараў, выкладчыкаў, навуковых супрацоўнікаў, аспірантаў і студэнтаў, удасканаліць камплектаванне кніжных фондаў, далей развіваць інфармацыйную дзейнасць бібліятэкі, шырэй практыкаваць адкрыты доступ да літаратуры, забяспечыць тэхнічнае пераасnашчэнне бібліятэкі, укараненне сучасных сродкаў аўтаматызацыі і механізацыі бібліятэчна-бібліяграфічнага абслугоўвання.

Вялікую ўвагу неабходна звярнуць на своечасовую падрыхтоўку і выданне падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, на якасць выдаваемай вучэбна-метадычнай літаратуры. Для гэтага аўтарам і аўтарскім калектывам трэба стварыць неабходныя ўмовы для плённай працы.

Навуковым калектывам універсітэта трэба сканцэнтраваць намаганні на распрацоўцы праблем, маючых вялікае навуковае і народнагаспадарчае значэнне, садзейнічаць шырокаму ўкараненню элементаў навуковых даследаванняў у вучэбны працэс.

Гэта толькі асноўныя пытанні, на якія нам неабходна звярнуць увагу ў гэтым навучальным годзе. Мы спадзяёмся, што калектыў універсітэта паспяхова справіцца з задачамі, якія паставіла перад ім партыя па паляпшэнню якасці падрыхтоўкі спецыялістаў для народнай гаспадаркі.

**У. ІВАШЫН,**
**прарэктар БДУ па вучэбнай рабоце гуманітарных факультэтаў.**

# Ружовы ранак

Літаратурная старонка

К. ЦЫБУЛЬСКІ

## Жураўлiная зара

Адзвінела павуціна
Над абрусам мурагоў.
Восень выткала хусціну
Пазалотаю стагоў.
І рукою чараўніцы
Сыпанула ў бор агню,
Дзе бярозкі-маладзіцы
Рады сонечнаму дню,

Дзе зязюлі кукавалі,
Цвет чаромхі дзе кіпеў,
Дзе галінкі ўздыхалі
Пад дзявочы, срэбны спеў.
Эх! Часіна залатая,
Вераснёвая пара,
Смуткам сэрца мне кранае
Жураўліная зара.



«...Слетает желтый лист...». Фотаэцюд В. ДРАЧОВА.

К. СЕВЕРИНЕЦ

«Не верьте глашатаям.
Вдруг предсказатели!» — злая
Толпа насмехается:
«Где научился рыдать?»
— Послушайте, люди,
А я ведь действительно знаю:
— Помпея погибнет!
И вы ужаснетесь тогда.
Бегу
И не радуюсь свету и солнцу.
— Поспею ль в Помпею?
Скорей! Добежать! Доползти!
Кричу на весь мир:
Берегитесь, Везувий взорвется!
Не внемлют...
А землю уже начинает трясти.
...Проснусь. Онемею.
Глаза заблестят:
Поспею ль в Помпею
Столетья спустя?



Нас не поймут
И, может быть, осудят
За то, что мы
Немыслимо просты...
И мы встречаемся
На перекрестках судеб,
По паре слов шепнем
И... след простыл!
Но остаются взгляды.
Жесты, лица,

Поступки наши
И случайно, вдруг
Они заставят нас
Остановиться
И разомкнут
Так надоевший круг
Обыденного, мелкого,
смешного
И жаждой бури, ветра и грозы
Толкнут нас
На немыслимое снова,
Заставят оглянуться, пережить
Высоких чувств
Ликующую прелесть,
Забытый стих
И струнный голос дней,
Когда мы жили так,
Как нам хотелось,
Но нам покажется:
Могли бы жить полней!

А. ПІСАРЫК

Хутка і вёска скончыцца.
Дзе ж мае равеснікі!
Завітаць мне хочацца
Да дзявочых веснічкаў.
Мой настрой не радужны —
Брамкі не адкрыліся.
Бо сяброўкі замужам,
Хлопцы пажаніліся.

### НА ВОЗЕРЫ

Хаваюцца лілеі,
Як качкі за плюшнік.
Стракаты поўдзень млее
Ад сонца й цішыні.
Аблокі, нібы чоўны,
Вятрыску не качаць...
Прамень цалуе шчокі
Лілеяў, ці дзяўчат?

### РОДНАЯ МОВА

*«А дзе тая крынічанька?»*
*(З народнай песні).*

З невычэрпных крыніц
Беларускае мовы,
Як па жмені суніц,
Я адшукваю словы.
Мова продкаў маіх
Не пагасне ў нашчадках.
Жыць ёй вечна ў крыві
І нясці людзям шчасце.
Хто б без мовы быў я!
Адшчапенец, няйначай...
Зычны спеў салаўя
Хіба хто перайначыць!

СТУДЭНЦКАЯ РЭЦЭНЗІЯ

## ДЗЕНЬ СУЧАСНЫ, ДЗЕНЬ МІНУЛЫ

Барыса Сачанку да апошняга часу называлі «пісьменнікам адной тэмы». І гэта зусім не выпадкова. У час вайны будучаму празаіку — а ў той час хлапчуку з глухой беларускай вёскі — давялося пабачыць і перажыць шмат гора. Ён добра памятае, як палілі разам з людзьмі хаты, як акупанты здзекаваліся над савецкімі грамадзянамі. Разам з аднавяскоўцамі хлопчык быў выгнан ў нямеччыну.

Тэма вайны, а больш дакладна, тэма мужнасці і патрыятызму непакораных — вось аснова амаль усіх твораў Б. Сачанкі.

У кнізе «Тры аповесці», якая ў мінулым годзе выдадзена ў выдавецтве «Мастацкая літаратура», пісьменнік паспрабаваў расшырыць творчы дыяпазон. Адкрывае зборнік аповесць «Не на той вуліцы». Аўтар звяртаецца да сучаснасці. Падзеі адбываюцца ў нашы дні.

Пісьменнік і час, пісьменнік і яго адказнасць перад народам — так коратка можна ахарактарызаваць гэты твор. У ім многа аўтабіяграфічнага, узятага з перажытага.

Аўтар уводзіць чытача ў пісьменніцкае асяроддзе, знаёміць з работай журналістаў. Але не гэта галоўнае. Канфлікт паміж «ліпавым» пісьменнікам Язэпам Тарасюком і сапраўднымі майстрамі мастацкага слова з'яўляецца фабулай аповесці.

...Да маладога супрацоўніка літаратурнага часопіса звяртаецца ўдава нядаўна памёршага старога празаіка Я. Тарасюка. Яна просіць дапамагчы разабраць ёй архіў нябожчыка.

Так Барыс Сачанка цесна звязвае лёс пачынаючага літаратара Калінкі з вядомым пры жыцці пісьменнікам, якім быў Язэп Тарасюк.

Старонка за старонкай, і мы разам з маладым героем пераконваемся, што Тарасюк зусім не той, за каго сябе выдаваў. Ніякі ён не пісьменнік, а звычайны графаман, воляй часу, абставін і непатрабавальных рэдактараў узнесены на літаратурны Парнас. Пятнаццаць выдадзеных кніг ускружылі галаву Язэпа. Ён лічыць сябе ледзь не жывым класікам і зусім не звяртае ўвагі на тую акалічнасць, што яго раннія выданні дагэтуль пыляцца на паліцах у кнігарнях у аддзеле ўцэненых. Гэтыя кнігі — макулатура.

Крытыка ўшчэнт разбівае «цагліны», як ацанілі калегі па працы творы Язэпа. Аднак Тарасюк не з тых, хто адступае. Ён лічыць гэтае «практыканцтва» не чым іншым, як падкопам пад яго аўтарытэт і з апломбам заяўляе: «Многіх класікаў не прызнавалі пры жыцці...» Такі ён для знаёмых. А на самай справе?

Адам Калінка знаёміцца з дзённікам графамана. Гэта адзіны твор у адзіным экземпляры, дзе Тарасюк застаецца самім сабою, дзе кожнае слова — горкае прызнанне ў адсутнасці і таленту, і звычайнага чалавечага шчасця, і згода з крытыкай...

Барыс Сачанка ставіць і такое пытанне: з чыёй лёгкай рукі ўбачыў свет першы твор гэтага няшчаснага чалавека? Як ні парадаксальна... саміх пісьменнікаў. Яны зрабілі з выдатнага дырэктара рэстарана пасрэднага літаратара. Міналі гады, выдаваліся кнігі-аднадзёнкі, расла адпаведна і ўпэўненасць у неіснуючых пісьменніцкіх здольнасцях...

У гэтай рэцэнзіі хацелася б пагаварыць яшчэ аб адной аповесці, якая ўвайшла ў кнігу. Я маю на ўвазе «Дыяруш Мацея Белановіча».

У мінулым Барыс Сачанка дэбютаваў у жанры гістарычнай аповесці творам «Англіцкая сталь», прыхільна сустрэтым грамадскасцю. І вось новая работа ў тым жа напрамку...

У сваім дыярушы Мацей Белановіч апавядае пра паўстанне Багдана Хмяльніцкага і падзеі, якія разгарнуліся ў сувязі з гэтым на тэрыторыі Беларусі.

Белановіч зусім не летапісец, хаця ў яго запісах шмат прозвішчаў, лічбаў, гістарычных фактаў.

Слуга пана Багуслава Радзівіла, ён да канца застаецца адданы свайму гаспадару. Патаемныя думкі Мацей давярае толькі паперы. Ён пратэстуе супраць жорсткасці і эгаізму князёў. Але пратэст гэты пасіўны, з аглядкаю на панскі бізун.

З аповесці чытач даведаецца аб многім цікавым з гісторыі беларускага і ўкраінскага народаў, аб іх сумеснай барацьбе за свабоду і незалежнасць. Цікавымі з'яўляюцца звесткі пра быт і жыццё сялян, іх адносіны да паўстання. Мацей Белановіч выказвае ўпэўненасць у перамозе простага люду над вяльможамі і гетманамі.

Барыс Сачанка быў вылучан на атрыманне Дзяржаўнай прэміі рэспублікі ў галіне літаратуры. Думаецца, што новая кніга празаіка — яшчэ адзін яскравы доказ правільнасці гэтага рашэння.

В. ЗАДАЛЯ.

СТУДЭНЦКАЯ РЭЦЭНЗІЯ

## ПАЭЗІЯ СЭРЦА

...Я перагарнула апошнюю старонку кніжкі — і прыпала да яе тварам: проста ніяк па-іншаму не магла выказаць свайго пачуцця любві, удзячнасці, павагі.

Маленькая кніжачка ў зялёнай вокладцы. Зборнік вершаў Марыі Шаўчонак «Свята зямлі».

Гэта сапраўдная паэзія, бо ідзе яна ад самага сэрца маладой паэтэсы. Юначая летуценнасць, сардэчная споведзь перад Бацькаўшчынай, хараство прынёманскага краю, чыстае каханне — асноўныя матывы вершаў. Я не бяру на сябе ролю крытыка, не лічу патрэбным у гэтым выпадку раскладваць па паліцах: дзе добра, дзе блага.

Паслухайце:

**Я ўсім была на свеце гэтым:**
**Стаяла грушай ля варот,**
**Не раз квітнела ў лузе летам,**
**Лятала ў вырай колькі год...**

**Таму з адказнасцю двайною**
**Рабіць павінна кожны крок,**
**Каб ні зямля, ні ўсё жывое**
**Ні ў чым не кінулі папрок.**

Кожны верш Марыі Шаўчонак нібы адкрыццё. А можа яно і сапраўды так, бо пасля чытання па-новаму глядзіш на свет. Паэтэса піша пранікнёна, чула, па-сардэчнаму проста і хораша.

Яна заўважае ўсё: і як па сіняму небу «ледзь бачны павучок праплыў», і што кожны лісток увосень «адсвечвае зарой, звініць манеткай залатой», піша і аб пяшчотных руках маці, што «могуць зняць любы цяжар з плячэй», любуецца высокімі нарачанскімі соснамі і захапляецца «сінім ранкам вясны», дрыготкімі пралескамі — вестунамі вясны. І сэрца яе, яе думкі назаўсёды звязаны з Радзімай.

**Прад табою, Радзіма,**
**Схіляюцца ніц,**
**Прад адзінай табой**
**Стаць магу на калені.**

Ёсць у паэзіі Марыі Шаўчонак лірыка кахання. У яе яна асаблівая, з ноткамі суму і жалю. Што ж, паэтэса лічыць: пра пачуццё не патрэбна гаварыць гучна, уголас. Кожнае сэрца кахае па-свойму...

Я ўдзячна за гэту паэзію, гэты зборнік. Кожны раз, перажыўшы пачуццё цудоўнага, становішся лепшым і душэўна багацейшым.

Т. МАНЁНАК, студэнтка.

Рэдактар А. А. ДЗЕРАШ.

НАШ АДРАС Мінск, універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.

АТ 00513 Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Заказ № 1591